одолеть, т.е. в целом обнаруживают оптимистичный настрой. В то же время китайские фразеологизмы часто содержат более глубокие культурные и философские аспекты, связанные с концепцией гармонии и баланса в организме, что свидетельствует о влиянии традиционной китайской медицины.

Представленные фразеологические единицы демонстрируют, как язык формирует восприятие болезни и здоровья, а также влияет на повседневное общение и взаимодействие людей.


1. Алещенко, Е. И., Фатеева, Ю. Г. Идиомы со значением здоровья-нездоровья в контексте русской фразеологии [Электронный ресурс]. – URL: https://cyberleninka.ru/article/n/idiomy-so-znacheniem-zdorovya-nezdorovya-v-kontekste-russkoy-frazeologii/viewer (дата обращения: 11.10.2024).
2. Бердяев, Н.А. Истоки и смысл русского коммунизма / Н. А. Бердяев. – М. : Наука, 1990. – 220 с.
3. Готлиб, О.М. Китайско-русский фразеологический словарь. Около 3500 выражений / О.М. Готлиб, Му Хуаин. – Иркутск: Изд-во ИГУ, 2019. – 596 с.
4. Ма Лун. Типы фразеологических единиц в русском и китайском языках / Ма Лун // Ученые записки УО «ВГУ им. П.М. Машерова». – Витебск, 2011. – Т. 12. – С. 198–204.
5. Фразеологический словарь русского литературного языка: в 2 т. / сост. А.И. Федоров. – Новосибирск: Наука, 1995.


## АНТЫЧНЫЯ ТРАДЫЦЫІ Ў МАСТАЦКІМ СВЕЦЕ МАКСІМА БАГДАНОВІЧА


***Іўкіна К.Ю.,***

*настаўнік беларускай мовы і літаратуры,*

*ДУА "Сярэдняя школа № 1 г. Дуброўна імя Г.А. Нікандравай",*

*г. Дуброўна, Віцебская вобласць, Рэспубліка Беларусь*



Ключавыя словы. Беларуская літаратура, проза, карэляцыя, апавяданні, сусветныя мастацкія традыцыі.

Keywords. Belarusian literature, prose, correlation, short stories, world artistic traditions.


Максім Багдановіч з высокай павагай ставіўся да антычнай літаратуры, таленавіта развіваў яе традыцыі гуманізму і грамадзянскасці, вучыўся паэтычнаму майстэрству ў антычных аўтараў і знаходзіўся пад іх моцным уплывам. У яго празаічнай спадчыне назіраецца арганічнае засваенне найбольш плённых ідэйна-мастацкіх кампанентаў антычнасці ў непасрэднай сувязі з індывідуальным творча-псіхалагічным вопытам. Ужо ў маленстве беларускі аўтар пазнаёміўся з культурай і літаратурай антычнага свету. Захапленнем антычнай культурай спалучалася ў Багдановіча з любоўю да Радзімы, да фальклорнай спадчыны. У сваіх творах ён часта згадваў антычных пісьменнікаў – Сафокла, Авідзія, Катула, Верлігія, Дэмасфена і іншыя, выкарыстоўваў вобразы такіх вядомых міфалагічных персанажаў, як Геракл, Антэй, Гея, Пегас.

Мэта артыкула: выявіць ступень значнасці творчага ўплыву антычнай літаратуры на аўтарскі стыль Максіма Багдановіча.

**Матэрыял і метады.** Матэрыялам даследавання ў артыкуле з'яўляецца "малая проза" названага пісьменніка, а таксама адпаведныя жанравыя прыклады з сістэмы антычнай літаратуры. Асноўнымі для навуковага аналізу абраны прыёмы канкрэтна-гістарычнага, структурна-аналітычнага і дэстрыптыўнага метадаў.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** У творчасці Багдановіча праявілася значная ўвага да мастацкага слова старажытнарымскага пісьменніка Публія Авідзія Назона, у прыватнасці да яго паэмы "Метамарфозы", якую называюць паэтычнай энцыклапедыяй антычнай міфалогіі. Як вядома, тут па-мастацку апрацоўваюцца грэка-рымскія міфы пра пераўвасабленне людзей і багоў у жывёл. Два такія прыклады Багдановіч пераклаў на беларускую мову: "Грамада зорак Карона" (песня 8, радкі 178-182) і "Ікар і Дзедал" (песня 8, радкі 189-220). Пісьменнік змог перадаць не толькі чароўнасць і прывабнасць арыгінала, але і яго своеасаблівыя форму і рытм. У перакладзе Багдановіча вобразная напоўненасць вельмі блізкая да антычнай першаасновы. У старажытнай міфалогіі беларускі аўтар знаходзіў цэлую скарбонку для адказу на пытанні пра існаванне

чалавека, сэнс яго жыцця, што і абумовіла асаблівую цікаўнасць пісьменніка да творчасці Авідзія, асабліва да яго "Метамарфоз" [1, с. 94].

Творчасць Багдановіча ўвабрала ў сябе і асобныя мастацкія аспекты, уласцівыя літаратурнай спадчыне рымскага пісьменніка Гая Валерыя Катула (каля 87-54 да н.э.), які ўвайшоў у гісторыю як заснавальнік рымскай лірыкі.

Багдановіч звярнуўся да вопыту пісьменніка-неатэрыка ў пошуках эстэтычных арыенціраў, мастацкіх сродкаў, літаратурных прыёмаў, тэм антычнай лірыкі, яе памераў і жанравых форм. Беларускі пісьменнік неаднаразова выкарыстоўваў узятыя з Катула словы "Я белым каменем адзначыў гэты дзень…" з паэмы "Аттис". Яны ўжытыя як пэўная сэнсавая паралель у апавяданні "Музыка", прысвечаным свайму народу. Катулаўскі радок падкрэслівае значнасць асабістых успамінаў беларускага аўтара, надае ім узнёслы эмацыянальны настрой.

Паралельны аналіз апавядання Максіма Багдановіча і твора "Аттис" Катула паказвае, што іх яднае вельмі многае ў ідэйна-мастацкім плане [2, с. 175].

**Заключэнне.** Такім чынам, выкарыстанне антычных матываў і вобразаў для Максіма Багдановіча – з'ява невыпадковая. Антычнасць у яго творах выступае найчасцей сродкам узмацнення лірычнай экспрэсіі, выяўлення ўнутраных перажыванняў і настрою героя. Антычныя традыцыі становяцца працэсам, непасрэдна звязаным з творчай актыўнасцю, талентам, спеласцю светапогляду Багдановіча. І гэта было не знешнім супадзеннем ці пагоняй за арыгінальнасцю. Антычная этыка і эстэтыка цалкам апавядалі індывідуальнаму жыццёваму і псіхалагічнаму вопыту пісьменніка, яго думкам, настрою і запатрабаванням эпохі. Яго творчы падыход да антычнай спадчыны заключаецца ў тым, каб, перапрацоўваючы і ўзбагачаючы антычныя матывы і вобразы, уздымаць іх да ўзроўню агульнанацыянальнага і праз іх да агульначалавечага.

1. Міклашэўскі, Я.В. Каханне і смерць, або Лёс Максіма Багдановіча / Я.В. Міклашэўскі. – Мінск: "Мастацкая літаратура", 2001. – 540 с.
2. Чырскі, М. Максім Багдановіч у Мінску / М. Чырскі. – Мінск: "Вышэйшая школа", 1986. – 246 с.

## СРОДКІ ПРЫЦЯГНЕННЯ ЎВАГІ КАРЫСТАЛЬНІКАЎ РЭКЛАМЫ Ў БЕЛАРУСКІХ ПЕРЫЯДЫЧНЫХ ВЫДАННЯХ ПАЧАТКУ XX СТ.

***Косціна В.Д.,***
*Цэнтр даследаванняў беларускай культуры, мовы і літаратуры*
*Нацыянальнай акадэміі навук Беларусі,*
*г. Мінск, Рэспубліка Беларусь*

Ключавыя словы. Рэклама, мова рэкламных тэкстаў, моўныя сродкі рэкламы, сродкі прыцягнення ўвагі, беларускія перыядычныя выданні пачатку XX ст.

Keywords. Advertising, the language of advertising texts, linguistic advertising tools, means of attracting attention, Belarusian periodicals at the beginning of the 20th century.

На сённяшні дзень мова рэкламы ў дастатковай ступені прааналізавана ў асноўным з пункту погляду маркетынгавай дзейнасці. У гістарычным аспекце прынцыпы стварэння тэкстаў рэкламнага зместу фактычна не даследаваны.

Мэта даследавання – аналіз сродкаў прыцягнення ўвагі карыстальнікаў рэкламы ў беларускіх перыядычных выданнях на этапе станаўлення (пачатак XX ст.).

**Матэрыял і метады.** Крыніцы фактычнага матэрыялу – беларускія перыядычныя выданні акрэсленага перыяду. Асноўныя метады: апісальны, кампаратыўны, класіфікацыйны, метад дыяхранічнага аналізу.

**Вынікі і іх абмеркаванне.** Існуе меркаванне, што «ў сучасным свеце інфарматыўнасць рэкламнага тэксту адыходзіць на другі план перад яго экспрэсіўнай насычанасцю. Гэта шмат у чым звязана з тым, што прапанова тавару перавышае попыт спажыўца. У такой сітуацыі стваральнікі рэкламных тэкстаў шукаюць усё новыя і новыя